УДК 633.12 : 631.527

Т. А. АНОХІНА, Н. К. ГАРДЗЕЕВА

НОВЫ СОРТ ГРЭЧКІ АНІТА БЕЛАРУСКАЯ

Каштоўныя ўласцівасці грэчкі, такія, як высокая біялагічная каштоўнасць бялкоў [1, 2], адносная скараспеласць культуры [3], магчымасць яе вырошчвання не толькі ў асноўных, але і ў паўкосных і пажніўных пасевах [4, 5], традыцыйныя незаменнасць для харчавання людзей,

абумоўліваюць удасканаленне яе сартавога сартыменту і тэхналогіі вырошчвання.

Так, на змену сорту Чарнаплодная Дзяржаўнай камісіяй па сортавыпрабаванні сельскагаспадарчых культур прапанаваны новы сорт дыплоіднай грэчкі Аніта Беларуская, які з 1991 г. раяніраваны ў Беларусі, Латвіі, Літве і некаторых абласцях РСФСР. Ён створаны ў Беларускім НДІ земляробства і кармоў метадам адбору па індэксу І-СУЗІС (суадносіны зерня і саломы) з папуляцыі сорту Юбілейная 2. Праведзены чатыры цыклы адбору з двухгадовай ацэнкай па патомству на высокі ўборачны індэкс. Гэта забяспечыла значнае павышэнне долі зерня ў агульнай біямасе. У сорту Аніта Беларуская яна блізкая да 1:1, г. зн. на адну долю саломы прыпадае адна доля зерня. Гэты сорт выгадна адрозніваецца ад усіх астатніх сартоў грэчкі, як дыплоідных, так і тэтраплоідных, таму што адсутнасць вялікай масы расліны аблягчае уборку прамым камбайнаваннем, асабліва калі ўмовы надвор'я не дазваляюць своечасова і якасна правесці раздзельную ўборку, як гэта было характэрна для 1990 г.

У якасці фону для адбору выкарыстоўвалася разрэджаная плошча жыўлення — 20×20 см, што дазволіла адбіраць генатыпы з высокай прадукцыйнасцю раслін, таму сорт Аніта Беларуская высокаўраджайны. Яго патэнцыяльная ўраджайнасць, паводле даных экалагічнага выпрабавання ў Гродзенскім занальным НДІ сельскай гаспадаркі, у сярэднім за апошнія пяць гадоў склала 28,8 ц/га пры максімальным яе значэнні 39,9 ц/га. У конкурсным сортавыпрабаванні БелНДІЗК патэнцыял гэтага сорту быў некалькі ніжэйшы: у сярэднім за 1986—1990 гг. сорт забяспечыў ураджайнасць 25,7 ц/га (табл. 1). Гэтым ён адрозніваецца ад сорту Чарнаплодная, ураджайнасць якога ў БелНДІЗК захавалася на тым жа ўзроўні, з якім ён быў перададзены ў Дзяржкамісію па сортавыпрабаванні сельскагаспадарчых культур у 1976 г.

Аб магчымасці атрымання высокай ураджайнасці сорту Аніта сведчыць вопыт калгаса імя Карбышава Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці, дзе ў 1989 г. было атрымана 33,3 ц/га зерня. Сярэдні ўраджай названага сорту ў 1990 г. склаў у гэтай вобласці 19,4 ц/га, што на 9 ц/га больш, чым у сорту Чарнаплодная, і на 7,0 ц/га больш, чым у сорту Свіцязянка.

Працягласць вегетацыйнага перыяду сорту Аніта Беларуская 80 сут, аднак у залежнасці ад умоў надвор'я і зоны вырошчвання ён можа скарачацца да 70 і павялічвацца да 96 сут. Вышыня раслін, як правіла, не перавышае 1 м і знаходзіцца ў межах 86—100 см. Сорт вельмі выраўнаваны па вышыні сцебластою, добра галініцца. Першае суквецце фарміруецца ў асноўным на пятым вузле, што дазваляе расліне ўтвараць не

Таблица 1. **Ураджайнасць сорту Аніта Беларуская ў параўнанні са стандартам — Чарнаплоднай, ц/га**

Пункт правядзення выпрабаванняў	Сорт	Год					Сярэдняе	НІР$_{095}$
		1986	1987	1988	1989	1990		
БелНДІЗК (Жодзіна)	Аніта Беларуская	25,8	26,7	29,1	25,0	21,7	25,7	
	Чарнаплодная	24,4	19,7	24,6	17,0	14,3	20,0	
	Адхіленне ад стандарта:							
	ц/га	+1,4	+7,0	+4,5	+8,0	+7,4	+5,7	1,8
	%	5,7	25,5	18,3	47,1	31,1	28,5	
Гродзенскі НДІ сельскай гаспадаркі (Шчучын)	Аніта Беларуская	29,7	39,9	29,1	27,2	17,9	28,8	
	Чарнаплодная	26,5	38,5	22,6	18,2	10,0	23,2	
	Адхіленне ад стандарта:							
	ц/га	+3,2	+1,4	+6,5	+9,0	+7,9	+5,6	1,5
	%	12,1	3,6	28,8	49,5	44,1	24,1	